Шаноўныя сябры і калегі,

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Інстытут археалогіі і этналогіі Польскай акадэміі навук і Таварыства даследчыкаў каменных індустрый SKAM (Stowarzyszenie Krzemieniarskie SKAM) запрашаюць вас прыняць удзел у міжнароднай навуковай канферэнцыі:

**«Перасякаючы межы. Міжрэгіянальныя і міжкультурныя ўзаемадзенні ў кантэксце вывучэння каменных артэфактаў»**

**(XV навуковы семінар SKAM)**

Семінар адбудзецца **17–19 кастрычніка 2018 г.** у **г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.** Па традыцыі штогадовых сустрэч SKAM, падчас канферэнцыі плануецца абмеркаванне шырокага спектру пытанняў, звязаных с вывучэннем палеатэхналогій апрацоўкі каменю. Заяўленая тэма таксама прадугледжвае, што канферэнцыя стане адпаведным месцам сустрэчы навуковых ідэй і традыцый, якія паходзяць з розных акадэмічных цэнтраў, і для камунікацыі паміж даследчыкамі, раздзеленымі межамі сучасных дзяржаў.

Праграма канферэнцыі будзе арганізавана ў межах сямі тэматычных і храналагічных секцый, прапанаваных даследчыкамі з розных акадэмічных асяродкаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы:

1. Ніжні палеаліт у Цэнтральнай Еўропе. Ранняя сведчанні і дыскусія пра псеўда-артэфакты.
2. Міжгрупавыя кантакты ў познім палеаліце.
3. Межы ў мезаліце? Узаемадзеянні і культурныя змены праз прызму каменных артэфактаў.
4. Тэхналогія апрацоўкі каменю ў неаліце і наступныя эпохі.
5. Розныя рэгіёны і культуры – розныя наборы каменных прылад?
6. Крамяністыя пароды, якія выкарыстоўваліся дагістарычнымі супольнасцямі: месцы здабычы, пераважныя гатункі, метады атрымання.
7. Агульныя пытанні вывучэння каменных індустрый.

Праграма сустрэчы таксама будзе ўключаць практычную секцыю, у межах якой прадугледжаны дэманстрацыя археалагічных калекцый, эксперыменты і кансультацыі з вядучымі спецыялістамі.

Працоўная мова канферэнцыі – англійская.

**Тэрмін падачы заявак** – да **1 чэрвеня 2018 г.** Прымаюцца вусныя (да 20 хвілін) і стэндавыя (фармат А1 – 594×841 мм) даклады. Запоўненыя рэгістрацыйныя формы (у дадатку) і тэзісы на англійскай мове памерам да адной старонкі просім дасылаць на электронны адрас: skam2018minsk@gmail.com

Арганізатары не пакрываюць выдаткі на праезд і пражыванне ўдзельнікаў. Памер арганізацыйнага ўзносу на ўдзел у канферэнцыі будзе паведамлены дадаткова.

ад імя Арганізацыйнага камітэту,
Віталій Ашэйчык
Аляксандр Вашанаў
Дагмара Х. Вэра
Івона Сабковяк-Табака